Министерство образования Республики Беларусь
Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»
Исторический факультет

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БЕЛОРУССКАЯ ГОСУДАРСТВЕННОСТЬ: ИСТОКИ, СТАНОВЛЕНИЕ, РАЗВИТИЕ (IX–XXI вв.)

Материалы
Республиканской научно-теоретической конференции

Минск, 29 июня 2017 г.

Минск
РИВШ
2017

УДК 323(476)(091)(082)
ББК 66.3(4Беи)я43
Б43

Р е к о м е н д о в а н о

советом исторического факультета
УО «Белорусский государственный педагогический
университет имени Максима Танка»
(протокол № 10 от 24 мая 2017 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
кандидат исторических наук доцент *А. В. Касович* (отв. ред.);
кандидат исторических наук доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук доцент *А. А. Корзюк;*
кандидат исторических наук доцент *А. Ф. Великий*

Р е ц е н з е н т ы :
доктор исторических наук профессор *А. М. Лютый;*
доктор исторических наук профессор *И. В. Варивончик*

Б43 **Белорусская** государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.) : материалы Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 29 июня 2017 г. / редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2017. – 232 с.
ISBN 978-985-586-041-0.

В сборнике представлены актуальные материалы исследований, посвященные проблемам белорусской государственности в историческом, социально-культурном и геополитическом аспектах.

Адресуется преподавателям, аспирантам и студентам вузов.

**УДК 323(476)(091)(082)**
**ББК 66.3(4Беи)я43**

**ISBN 978-985-586-041-0**

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

С 2005 года в Институте издаётся журнал “Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні”, Он вошёл в список научных журналов, включённых в перечень ВАК Беларуси для публикации статей соискателей учёных степеней кандидатов и докторов наук.

## ПРАСПЕКТ ЖУКАВА Ў МАСКОЎСКІМ РАЁНЕ Г. МІНСКА

***Казак Ю.А., 1 курс, філалагічны факультэт, БДПУ, Мінск***
***навук. кір. – Рацько А.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт, БДПУ***

Праспект Жукава – магістральная вуліца, размешчаная ў такіх раёнах Мінска як Кастрычніцкі, Фрунзенскі і Маскоўскі, які сёлета адзначае сваё саракагоддзе. Праспект з’яўляецца часткай Другога мінскага кальца, якая злучае праспект Пушкіна з вуліцай Аэрадромнай.

Варта адзначыць, што ў Маскоўскім раёне ёсць шэраг вуліц, названых у гонар тых, хто змагаўся супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У назвах вуліц і завулкаў, паркаў і сквераў увекавечаны прозвішчы падпольшчыкаў М.Л.Гебелева, В.Д. Шацько. М.П. Дразда, лётчыкаў Б.С. Акрэсціна і Я.М. Бялецкага, арганізатараў партызанскага руху І.Я. Алібегава, В.З. Каржа, партызана П.І. Купрыянава, камандзіра танкавага ўзвода Ю. Рафіева. І гэта далёка не ўвесь спіс. Адна з вуліц носіць імя народнага паэта Янкі Брыля, які падчас вайны быў сувязным партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, партызанам-разведчыкам брыгады «Камсамолец», рэдактарам газеты «Сцяг свабоды» і сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала», газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». У тапонімах Маскоўскага раёна ўвекавечана імя Васіля Ісакавіча Талаша, славутага дзеда Талаша, які ў час Айчыннай вайны дапамагаў партызанам, за што быў арыштаваны акупантамі і пасаджаны ў петрыкаўскую турму, а пасля вызвалення супрацоўнічаў з мінскімі падпольшчыкамі.

Сваю назву праспект Жукава атрымаў у 1977 г. На першым корпусе дома № 21 размешчана мемарыяльная дошка, якая апавядае, што праспект названы ў гонар савецкага палкаводца, Маршала Савецкага Саюза, міністра абароны СССР Георгія Канстанцінавіча Жукава, які паспяхова ажыццявіў першую ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наступальную аперацыю. Г.К. Жукаў ажыццяўляў каардынацыю дзеянняў франтоў пад Сталінградам, у дні прарыву блакады Ленінграда, у бітве пад Курскам, у бітвах за Днепр. Ён стаў першым маршалам СССР з пачатку вайны. Разам з салдатамі маршал распісаўся на апаленай сцяне рэйхстага. 8 мая 1945 г. Г.К. Жукаў па даручэнню савецкага Вярхоўнага Галоўнакамандавання прыняў у Берліне капітуляцыю фашысцкай Германіі. 24 чэрвеня 1945 г. у Маскве на Чырвонай плошчы Г.К. Жукаў прымаў урачысты Парад Перамогі [4].

Маршал Г.К. Жукаў прымаў непасрэдны ўдзел у вызваленні нашай сталіцы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дзякуючы яму ў Мінску захаваліся некалькі важных для ўрада будынкаў, якія павінны былі быць узарваныя па планах немцаў. Вось як аб гэтым выказаўся сам Жукаў у сваёй кнізе “Успаміны і разважнні”: “Па дадзеных беларускіх партызан, якія дзейнічалі ў раёне Мінска, нам стала вядома, што Дом урада, будынак ЦК партыі Беларусі і акруговы Дом афіцэраў, якія захаваліся ў Мінску, спешна мініруюцца і рыхтуюцца да выбуху. Каб выратаваць гэтыя найбуйнейшыя будынкі, было вырашана паскорыць рух на Мінск танкавых падраздзяленняў і паслаць разам з імі атрады размініравання. Мэта заключалася ў тым, каб прарвацца ў горад, не ўвязваючыся ў баі на подступах, і захапіць гэтыя ўрадавыя будынкі.

Задача была бліскуча выканана. Будынкі былі размініраваныя і захаваныя”.

Сярэдняя школа № 83 г. Мінска названа ў імя Г.К. Жукава. Вучні і калектыў гэтай навучальнай установы з гонарам ушаноўваюць імя Маршала: у мінулым годзе на базе школы праводзіўся міжнародны конкурс творчых работ “Вялікая памяць аб вялікім палкаводцы”, прысвечаны стодваццатай гадавіне з дня нараджэння Г.К. Жукава. У завяршэнні конкурса адбылася Міжнародная адкрытая навукова-практычная канферэнцыя «Асоба ў гісторыі: Г.К. Жукаў у пераломных бітвах Вялікай Айчыннай вайны».



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У маі 2007 г. ў скверы па вуліцы Чыгуначнай быў адкрыты бюст Маршала Савецкага Саюза Георгія Жукава. Ён выкананы з граніту і ўстаноўлены на пастаменце вышынёй 4 метры. Аўтары кампазіцыі – скульптар Анатоль Арціновіч і архітэктар Аляксандр Жылінскі. У 2008 г. рашэннем Мінгарвыканкама скверу ў раёне вуліц Чыгуначная і Мініна прысвоена імя вялікага палкаводца[4]. Сквер імя Жукава сваімі абрысамі нагадвае трохкутнік. Бюст Маршала ўсталяваны ў канцы сквера, супрацьлеглым уваходу ад праспекта. Увагу прыцягваюць шматлікія маленькія дошачкі з прозвішчамі ля маладых дрэў. Сквер даволі ўтульны з яго высокімі дрэвамі, пад такімі прыемна хавацца летам ад дзённай спёкі, пылу і шуму праспекта.

Патрапіўшы ў гэту частку Мінска, знаёмішся з новым абліччам сталіцы, разумееш, што Мінск – гэта не толькі сучасныя шматпавярховыя будынкі, бясконцыя натоўпы, крамы і кафэ. Ідучы ўздоўж праспекта заўважаеш, што большая частка пабудоў – жылыя дамы вышынёй двух-пяці паверхаў. Бачна, што гэтыя дамы былі пабудаваны прыблізна ў 60-70-х гг. мінулага стагодзя. У доказ гэтага на адным з дамоў можна ўбачыць лічбу 1967, выкладзеную чырвонай цэглай пад самым дахам. На праспекце пануе атмасфера канца дваццатага стагоддзя, бо, нягледзячы на тое, што ўзрост некаторых будынкаў прыхаваны пад рознакаляровай тынкоўкай, большасць будынкаў застаецца ў сваім першапачатковым выглядзе. Вялікую долю атмасфернасці праспекту надаюць шматлікія дрэвы: сценкі з шчыльна пасаджаных елачак-туяк абараняюць панадворкі ад дарожнага пылу, а самі панадворкі ўпрыгожаны разгалістымі яблынямі.

Архітэктура бізнэс-цэнтра “Красавік” кантрастуе з архітэктурай мясцовых будынкаў. У сонечнае надвор’е ў шкле “Красавіка” адбіваюцца аблокі. За кошт гэтага будынак здаецца празрыстым і ствараецца эфект быццам аблокі бачныя скрозь шкло.

Увагу прыцягвае зусім новы сучасны шматкватэрны дом, пабудаваны ў выглядзе паўкруга. У падсвядомасці паўстае вобраз рымскага Калізея. Здаецца дзіўнай аналогія “шматкватэрны дом - амфітэатр”. Але нічога дзіўнага, бо вялікая шыльда побач з будынкам сведчыць, што гэты дом так і называецца – “Калізей”.

Зусім недалёка ад “Калізея” – рамонкавае поле. Кветкі на ім красуюць круглы год, бо гэтае поле – аэраграфія на сцяне аднаго з дамоў. Далей віднеюцца аднапавярховыя прыватныя дамы. Калі ідзеш паблізу іх, чуецца брэх сабакі-вартаўніка. Паблізу таго месца, дзе праспект Жукава ператвараецца ў вуліцу Аэрадромную, стаіць цагляная вежа, адзначаная як культурна-гістарычная каштоўнасць.

Такім чынам, убачыўшы, што на праспекце працягласцю каля трох кіламетраў спалучыліся гісторыя і сучаснасць, пейзажы ўрбаністычныя і тыя, што больш нагадваюць вясковыя, я магу зрабіць для сябе выснову, што Мінск – горад кантрастаў.

**Літаратура**

1. Георгій Канстанцінавіч Жукаў [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя – свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Георгій_Канстанцінавіч_Жукаў. Дата доступу: 21.03.2017.

2. Іофе, Э. Жукаў Георгій Канстанцінавіч / Э. Іофе // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 3. Гімназіі – Кадэнцыя / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996. – 527 с.

3. Маршалы Перамогі: Георгій Канстанцінавіч Жукаў [Электронны рэсурс] // Беларускае тэлеграфнае агенцтва. – Рэжым доступу: http://blr.belta.by/dossier/view/marshaly-peramogi-georgij-kanstantsinavich-zhukau-39013/. Дата доступу: 19.03.2017.

4. Московский район (Минск) [Электронный ресурс] // Википедия – свободная энциклопедия. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Московский_район_(Минск). Дата доступа: 25.03.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ